РАК: ВЫЯВІЦЬ, КАБ НЕ СПАЗНІЦЦА 9



ТОЕ, ШТО НАС ЯДНАЕ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 ЧЭРВЕНЯ 2018 г. СЕРАДА № 121 (28737)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр:**

*«Найважнейшым стратэгічным напрамкам развіцця будаўнічага комплексу з'яўляецца нарошчванне экспарту будаўнічых паслуг і яго далейшая дыверсіфікацыя, але без росту прадукцыйнасці працы, мадэрнізацыі вытворчасці, зніжэння выдаткаў і пераходу на выкарыстанне лічбавых тэхналогій мы не зможам канкурыраваць на знешніх рынках, павышаць узровень і якасць жыцця насельніцтва. Патрэбны выразныя і зразумелыя, а галоўнае, абгрунтаваныя паказчыкі эфектыўнасці будаўнічай галіны».*

# Падарункі для беларусікаў



Напярэдадні Дня Незалежнасці БРСМ трэці раз праводзіць прыгожую акцыю з нацыянальным каларытам «Падары немаўляці вышыванку». Учора Мінскі абласны радзільны дом наведала ініцыятыўная група гэтай арганізацыі на чале з першым сакратаром Цэнтральнага камітэта аб'яднання Дзмітрыем ВАРАНЮКОМ, каб уручыць трыццаці маладым матулям і жанчынам, якія літаральна заўтра-паслязаўтра таксама стануць матулямі, сімвалы-абярэгі — вышыванкі.

— Перададзены нам у спадчыну ад продкаў беларускі арнамент з'яўляецца своеасаблівым шыфрам, які не толькі аберагае ад сурокаў, але і дае фізічныя сілы, напаўняе жыццё сэнсам, — сказаў на сустрэчы Дзмітрый Варанюк.

На гэтым фота будучыя матулі, якія чакаюць з'яўлення сваіх сынкоў і дачушак з падоранымі вышыванкамі.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

**Больш здымкаў з гэтай акцыі глядзіце на сайце www.zviazda.by**

## КОРАТКА

- Міністэрства лясной гаспадаркі хадайнічае аб поўным зняцці забарон і абмежаванняў на наведванне лясоў. Пакуль рашэнне аб адмене абмежавальных мер прынялі ў чатырох раёнах Мінскай вобласці: Дзяржынскім, Мінскім, Стаўбцоўскім і Чэрвеньскім.
- **У Беларусі зніжаюцца працэнты па валютных крэдытах для аграбізнесу.**
- Кампанія Adidas і Міжнародная федэрацыя футбола паказалі афіцыйны мяч плэй-оф ЧС-2018 па футболе, ён атрымаў назву Telstar Mechta.



- **Палажэнне аб парадку правядзення рэспубліканскага конкурсу «Нацыянальная літаратурная прэмія» зацверджана пастановай Савета Міністраў.**
- Атрад ганаровай варты Кітая прыме ўдзел у парадзе войскаў у Мінску. Кітайскія ваеннаслужачыя ўжо прыбылі ў Мінск і прыступілі да трэніровак разам з беларускімі і расійскімі вайскоўцамі.

Жывіце бяспечна!

# ПРАЙСЦІ ПРАЗ АГОНЬ І ПАЛАСУ ПЕРАШКОД

**У канцы мінулага тыдня ў Заслаўі адбылася незвычайная стажыроўка. Восем юнакоў з Маладзечанскага, Вілейскага і Мядзельскага раённых атрадаў аховы правапарадку Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі прыехалі ў пажарную аварыйна-выратавальную часць № 8 горада Заслаўя. Там яны мусілі правесці з ратавальнікамі цэлыя суткі — з васьмі да васьмі раніцы, і на сабе выпрабаваць усе складанасці гэтай прафесіі.**

СТАР. 8



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Гарачая тэма

# ПАПРАЎКА НА ЗАСУХУ

## Мінсельгасхарч: для правядзення работ па захаванні ўраджаю выдзеленыя ўсе неабходныя дадатковыя сродкі

**Работы па перасяванні пашкоджаных ад засухі сельгасугоддзяў ужо вядуцца згодна з планам і з улікам умоў надвор'я. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. У Мінсельгасхарчы таксама адзначылі, што для правядзення работ па захаванні ўраджаю ўжо выдзеленыя ўсе неабходныя дадатковыя аб'ёмы паліва, насення і ўгнаенняў.**

Па звестках міністэрства, з-за засухі ў краіне загінула каля 2 % пасеваў, а каля 3,6 % — пашкоджана. Усяго пацярпелі больш за 260 тысяч гектараў сельгасугоддзяў. На пашкоджаных пасяўных плошчах ужо высейваюць пажніўныя культуры.

Больш за ўсё ад засухі пацярпелі пасевы ў Гомельскай, Брэсцкай і Мінскай абласцях. На Брэстчыне пашкоджана 52 тысячы га, у тым ліку 42 тысячы га збожжавых, 5 тысяч га кукурузы, 2,5 тысячы га лёну, каля 1 тысячы га рапсу. Аграрыям трэба цалкам перасяваць аднагадовымі культурамі 20 тысяч га палёў.

У Гомельскай вобласці загінула 63,5 тысячы га пасеваў, у тым ліку 44,5 тысячы га азімых збожжавых. У Гродзенскай вобласці ўрон нанесены 38 тысячам га, у Мінскай — 40 тысячам, у Магілёўскай — 30 тысячам га. Віцебская вобласць пацярпела менш за астатнія рэгіёны, там пашкоджанымі прызнаны толькі 1200 гектараў лёну.

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Вы яшчэ паспяваеце аформіць падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі — будзе цікава!